УДК 94(474/476)ВКЛ

# МЕСЦА ГАНАРОВЫХ ТЫТУЛАЎ У САЦЫЯЛЬНАЙ СТРУКТУРЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА XVI–XVIII СТ

***Павел Булаты***
*Minsk, Belarus*

У артыкуле разглядаецца месца ў сацыяльнай структуры ганаровых тытулаў, якія прадстаўнікі магнатэрыі Вялікага Княства Літоўскага атрымалі ад імператара Святой Рымскай імперыі. Увага надаецца вызначэнню ролі тытулаў у грамадстве, раскрываюцца прычыны існавання тытулаў, аналізуецца статус іх носьбітаў.

***Ключавыя словы: шляхта, тытулы, статус, Святая Рымская імперыя***

Дзякуючы шчыльным дыпламатычным стасункам паміж Святой Рымскай імперыяй і Вялікім Княствам Літоўскім у першай палове XVI стагоддзя ў ВКЛ з’яўляюцца замежныя ганаровыя імперскія тытулы – князь і граф. Іх носьбіты – паслы вялікага князя літоўскага ў Святую Рымскую імперыю, якія атрымлівалі ганаровы тытул за паспяховую дыпламатычную місію і ў асабістых палітычных мэтах нямецкага двара. З’яўленне тытулаў у сацыяльнай структуры адразу выклікала супярэчанні ў грамадстве Вялікага Княства Літоўскага. Звязана гэта з тым, што да прэцэдэнту атрымання замежнага тытулу Мікалай Мікалаевіч Радзівіл па мянушцы Amor Poloniae у 1518 годзе, права на княжацкі тытул мелі толькі спадчынныя князі па крыві (Рурыкавічы, Гедымінавічы). Прыняцце замежнага тытулу ўводзіла новы звычай, які парушаў існуючы лад і роўнасць шляхецкага саслоўя. Грунтуючыся на пастановах сойму 1638, 1641, 1673 гг. [1, с. 441-442; 2, с. 8-9; 3, с. 73], дзе абмяркоўвалася пытанне тытулатуры, можна сцвярджаць, што ў прававых і сацыяльных аспектах наяўнасць тытулу з’яўлялася фармальнасцю, якая ў рэчышчы панавання прынцыпу шляхецкай роўнасці не надавала тытуляванай асобе якіх-небудзь пэўных прэрагатыву [4].

Нягледзячы на фармальнасць тытулу і адсутнасць сацыяльных прэферэнцый ад яго наяўнасці, іх носьбіты працягвалі прытрымлівацца ганаровай тытулатуры. Звязана гэта, на нашу думку, з наступным.

У XV–першай палове XVI ст. узмацнелыя служылыя паны складалі самую багатую і моцную групу шляхецкага саслоўя. Па паходжанні яны з’яўляліся нашчадкамі найвышэйшых баярскіх родаў Вялікага Княства Літоўскага [5, с. 105]. Дзякуючы атрыманым за службу ад вялікага князя высокім адміністрацыйным пасадам ды значным зямельным уладанням, з сярэдзіны XV ст. пачынаюць фармавацца буйныя родавыя латыфундыя. Як адзначае даследчыца Н. Скеп’ян, маёмасны стан стаў фактарам, які абмяжоўваў колькасць родаў, што маглі патрапіць да бліжэйшай рады вялікага князя, бо, калі ў XV ст. зямельныя падараванні і ўрады надаваліся дзякуючы асабістым якасцям і добрай службе вялікаму князю, то з пачатку XVI ст. менавіта добры маёмасны стан станавіўся неабходнай умовай для атрымання пасады і ўваходжання ў склад радных паноў [6, с. 29–30]. У адзначаны перыяд у асяроддзі шляхты пачынаецца працэс вылучэння праслойкі, якая з часам узмацнілася і з яе пачынае фармавацца эліта грамадства.

Пад элітай у сярэднявечным і раннемадэрным грамадстве Вялікага Княства Літоўскага трэба разумець вышэйшыя пласты грамадства, якія ажыццяўляюць функцыі кіравання (уваходзяць у склад Паноў-рады), развіцця навукі і культуры (шляхам фундацый і мецэнацкай дзейнасці). З элітай у Вялікім Княстве Літоўскім атаясамліваецца магнатэрыя. Хоць дадзеная група і не мела юрыдычна замацаванага статусу, а ў дзяржаве панаваў прынцып шляхецкай роўнасці, тым не менш, вузкае кола людзей, якія займалі ў іерархічнай сацыяльнай структуры пануючае становішча, існавала.

ПолесГУ

Галоўнымі ўзаемазвязанымі паміж сабою крытэрыямі прыналежнасці да магнатэрыі ў час яе фармавання ў канцы XV ст. – сярэдзіне XVI ст. былі: вялікія зямельныя латыфундыі і трыманне найвышэйшых урадаў. Пашырэнне зямельных уладанняў адбывалася з дапамогай выгадных шлюбаў, вялікакняжацкіх наданняў, атрымання іх у спадчыну [6, с. 27]. Так, паны радныя – тыя, хто займаў пасады, якія давалі права на ўваход у раду: маршалак, канцлер, гетман, падскарбі, ваяводы, кашталяны – да сярэдзіны XVI ст. складалі 0,8% ад агульнай колькасці землеўласнікаў, але ў іх руках было сканцэнтравана 30,2 % усяго землеўладання [5, с. 106]. Кансалідацыя магнатэрыі прывяла да інстытуцыялізацыі палітычнага органа (Паноў-рады) і манапалізацыі найважнейшых дзяржаўных пасад [7, с. 23], якія знаходзіліся ў руках вельмі невялікай колькасці родаў.

Прыклад першых пакаленняў родаў, якія займелі тытул ад германскага імператара (Радзівілы, Хадкевічы, Тышкевічы), паказвае, што яго носьбіты як раз і адносіліся да пануючай эліты. У айчыннай гістарычнай навуцы найбольш трывалым метадам падзелу шляхты на розныя маёмасныя катэгорыі з’яўляецца прапанаваны даследчыкам М. Спірыдонавым [8]: маёмасны стан вызначаецца паводле колькасці ўзброеных коннікаў, выстаўленых у войска (згодна з ухвалай сойма Вялікага Княства Літоўскага 1567 г. кожны землеўладальнік павінен быў выстаўляць у войска 1 узброенага конніка з 10 сялянскіх «службаў»). Да катэгорыі землеўладальнікаў-магнатаў адносіліся тыя, хто выстаўляў у войска больш за 100 коннікаў (адпаведна, валодаў больш чым 1000 дымоў). Паводле вайсковага попісу 1567 г. князь Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка выстаўляў у войска 539 узброеных коннікаў, граф Ян Геранім Хадкевіч выводзіў на паспалітае рушэнне 360 коннікаў, бацька і сын графы Васіль і Юры Тышкевічы разам ставілі 128 вершнікаў [9, стб. 434–435, 437, 445, 453]. Гэта дазваляе вызначыць дадзеныя роды як магнацкія паводле маёмаснага стану. Адзначым, што іншыя тытулярныя роды (Гаштольды і Іллінічы) у дадзеным кантэксце не разглядаюцца ў сувязі з іх выгасаннем. Дададзім, што, адзначаныя вышэй прадстаўнікі тытулярных родаў займалі ключавыя дзяржаўныя пасады і з’яўляліся сенатарамі Вялікага Княства Літоўскага, вызначаліся высокай ступенню сацыяльнай актыўнасці [10, с. 126–161].

У працэсе афармлення магнацкага саслоўя, акрамя вялікіх латыфундый і ключавых дзяржаўных пасадаў, сярод прыкмет прыналежнасці да магнацкага саслоўя, вылучаецца шэраг дадатковых якасцей магнатэрыі. Па меркаванню даследчыцы А. Семянчук, адзначаюцца наступныя прыкметы: блізкасць да каралеўскага двара, сямейныя сувязі і значэнне роду, а таксама асабістыя якасці [11, с. 141]. Спадарожна пачынае фармавацца і магнацкі двор з разгалінаванай сеткай службоўцаў [6, с. 40], які ў значнай ступені адрозніваўся ад звычайнага шляхецкага, бо ствараўся на ўзор і падабенства двара каралеўскага (альбо велікакняжацкага) [11, с. 140; 12, с. 81]. Сваю высакароднасць прадстаўнікі роду замацоўваюць у летапісных помніках, пры магнатах будуюцца рэзідэнцыі, набывае актыўнасць мецэнацкая дзейнасць [6, с. 40], ствараюцца родавыя архівы [13, с. 344].

У шэраг дадатковых якасцей, якія падкрэслівалі прыналежнасць да пануючай эліты грамадства, на наш погляд, варта ўключыць наяўнасць тытулу. Атрымаць яго было досыць складана (а пасля Люблінскай уніі амаль немагчыма): трэба было мець тытул спадчыны, альбо тытул, які атрымлівалі паслы вялікага князя, ажыццявіўшы паспяховую дыпламатычную місію (гэты факт ужо абмяжоўваў кола патэнцыйных носьбітаў тытулу, бо ў значныя пасольствы, як правіла, выпраўляліся толькі саноўнікі высокага рангу [14, с. 208; 15]). Валоданне тытулам (княжацкім, графскім) узвышала яго носьбітаў, і з’яўлялася каштоўным здабыткам для роду, у значнай ступені павялічвала яго прэстыж. Тытул рабіў магната адметным ад іншых прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя і, хай фармальна, у пэўнай ступені ўзвышаў у саслоўнай лесвіцы, а таксама надаваў вонкавага лоску тытулярнаму двару, што падкрэслівала магнацкую выключнасць. Наяўнасць тытулу з’яўлялася візуалізацыяй і прыкметай – праз геральдыку, подпіс тытулу ў дакументах – прыналежнасці да эліты грамадства.

Полесгу

Тэзіс аб тым, што тытул – сведчанне прыналежнасці да пануючай эліты, грунтуецца на падставе аналізу колькасці і долі тытулаваных вышэйшых ураднікаў Вялікага Княства Літоўскага [16], які быў здзейснены пры дапамозе матэматычна-статыстычнага выбарчага метаду даследавання. Засяродзім увагу на тым, што намі ўлічваліся як тытулаваныя асобы з тытуламі замежнымі (князь і граф Святой Рымскай імперыі), так і асобы са спадчыннымі тытуламі, носьбіты якіх уваходзілі ва ўрад Вялікага Княства Літоўскага (шэраг родаў – нашчадкаў удзельных князёў, захавалі свой уплыў і ўваходзілі ў пануючыя колы дзяржавы пасля XV ст.). Звернем увагу яшчэ на такую акалічнасць, як займанне адной асобай некалькі пасадаў адначасова. У нашым аналізе гэта не істотны чыннік, бо мы робім акцэнт на пасадзе і доле тытулаваных ураднікаў у межах асобных інстытутаў улады.

Разглядзім долю тытулаваных асоб у генеральнай сукупнасці асобных пасад. З 17 асоб, якія ў перыяд пачатку XVI – канца XVIII ст. займалі пасаду канцлера – 11 мелі спадчыны тытул, што складае 64%. З 25 маршалкаў 11 з'яўляліся тытулаванымі (44%). З 21 гетмана – 11 з тытулаваных родаў (52%). З 29 падскарбіяў 3 тытулаваныя (10%). З ліку 278 ваявод 65 мелі тытул (23%), а з 340 кашталянаў – 50 тытулаваных (14%). Адзначым, што з асяроддзя кашталянаў пераважная большасць тытулаваных – носьбіты спадчынных княжацкіх тытулаў, у выпадках іншых пасад дамінуюць тытулы замежныя (граф і князь Святой Рымскай імперыі). На пасадах ніжэйшага ўзроўні прадстаўнікоў тытулаванай знаці налічваюцца адзінкі.

Пры дапамозе механічнай выбаркі ўрадавых службоўцаў разгледзім склад паноў-рады ў пэўныя перыяды. Для аналізу мы адабралі адрэзкі часу ў 50 год і разгледзелі асоб, якія займалі пэўныя пасады, па стане на 1550, 1600, 1650, 1700, 1750 гг. Пасады для большай нагляднасці падзелены на тры катэгорыі ў адпаведнасці з шырынёй выбаркі (разам разглядаюцца пасады, якія на вызначаны час былі адзінкавымі (канцлер, маршалак, гетман, падскарбі), асобна разглядаюцца пасады, якія маюць рэгіянальную прывязку: ваявода, кашталян). Да групы 1 аднесеныя: канцлер, маршалак, гетман, падскарбі; 2 – ваяводы; 3 – кашталяны. Так, у выбарцы па першай групе: у 1550 г. – на 4 ураднікі 2 тытулаваныя (канцлер і маршалак); у 1600 г. – 1 з 4 (гетман); 1650 г. – 1 з 4 (канцлер); 1700 г. – 2 з 4 (канцлер і маршалак); 1750 г. – 2 з 4 (гетман і маршалак). Па другой групе, дзе прадстаўленыя ваяводы (Брэсцкі, Мінскі, Мсціслаўскі, Наваградскі, Смаленскі, Трокскі, Віленскі, Віцебскі, стараста Жамойцкі, а з 1600 – ваявода Інфлянцкі): у 1550 г. – з 10 ваявод 3 мелі тытул; 1600 г. – 6 з 11; 1650 г. – 4 з 11; 1700 г. – 1 з 11; 1750 г. – 2 з 11. Па трэцяй групе, дзе разглядаліся кашталяны (выбарка пачынаецца з 1600 г, у сувязі з тым, што ў 1550 г. пасады не існавала ў пераважнай большасці рэгіёнаў; рэгіянальны ахоп той жа, што і ў групе №2, кашталян інфлянцкі дадаецца з 1700 г.): у 1600 г. – з 10 кашталянаў 0 тытулаваных; 1650 г. – 1 з 10; 1700 г. – 0 з 11; 1750 г. – 2 з 11.

Звернем увагу і на духоўную каталіцкую эліту – пасаду Віленскага епіскапа. Так, з пачатку XVI ст. па канец XVIII ст. з 19 епіскапаў 5 паходзіла з тытулаваных сем'яў. Сярод грэка-каталіцкіх мітрапалітаў прадстаўнікоў тытулаваных родаў не было.

Акрэсленая значная доля тытулаваных ураднікаў (асабліва сярод канцлераў, маршалкаў, гетманаў), якія займалі ключавыя пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім сведчыць аб тым, што тытул – атрыбут пануючай эліты. Але пасады займаліся не дзякуючы наяўнасці тытулу, як тое было ў Заходняй Еўропе, а наадварот – тытулы здабываліся дзякуючы пасадам. І ў далейшым ганаровыя тытулы з'яўляліся вонкавай адметнасцю роду, сведчаннем прыналежнасці да пануючых колаў, што падкрэслівала ўласны прэстыж і сямейную выключнасць носьбітаў.

Такім чынам, нягледзячы на намінальнасць тытулу і адсутнасць сацыяльных прэферэнцый ад яго наяўнасці, іх носьбіты працягвалі прытрымлівацца ганаровай тытулатуры, што звязана з працэсам вылучэння ў асяроддзі шляхты магнацкай праслойкі, якая з часам склала эліту грамадства. У працэсе афармлення магнатэрыі, апроч буйных зямельных уладанняў і ключавых пасад, вылучаецца шэраг дадатковых якасцей магнатэрыі, у які ўключаецца наяўнасць тытулу. Тытул, як рэдкі атрыбут, рабіў магната адметным ад іншых прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя і, хоць па большай частцы

фармальна, узвышаў у саслоўнай лесвіцы, а таксама надаваў вонкавага лоску тытулаванаму двару, што падкрэслівала магнацкую выключнасць. Высокая доля тытулаваных ураднікаў сярод ключавых пасад сведчыць аб тым, што тытул – атрыбут пануючай эліты.


1. Volumina Legum : w 10 t. – SPb., – 1859–1860. – T. 4. – 1859. – 501 s.
2. Volumina Legum : w 10 t. – SPb., – 1859–1860. – T. 5. – 1860. – 468 s.
3. Volumina Legum : w 10 t. – SPb., – 1859–1860. – T. 7. – 1860. – 408 s.
4. Булаты, П. Ю. Прававы статус тытулаў Святой Рымскай імперыі ў Вялікім Княстве Літоўскім / П. Ю. Булаты // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. научн. ст. / Полесский гос. ун-т. ; под ред. Р. Гагуа. – Пинск, 2017. – Вып. 2. – С. 19–22.
5. Лойка, П. А. Афармленне шляхецкага саслоўя ў Вялікім Княстве Літоўскім / П. А. Лойка // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / Белар. дзяж. ун-т. – Мінск, 2010. – Вып. 5. – С. 102–115.
6. Скеп’ян, Н. Да пытання фармавання магнацкага саслоўя ў ВКЛ у XV– першай палове XVI ст. / Н. Скеп’ян // ARCHE Пачатак. – 2014. – № 6. – С. 26–41.
7. Пятраўскас, Р. Чаму вымірае магнатэрыя: лёсы магнацкіх родаў ВКЛ / Р. Пятраўскас. // ARCHE Пачатак. – 2014. – № 6. – С. 11–26.
8. Спиридонов, М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV–XVI вв.) / М. Ф. Спиридонов. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 223 с.
9. Русская историческая библиотека : в 40 т. – СПб. – 1872–1927. – Т. 30. – 1914. – 896 с.
10. Падалінскі, У. А. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай / У. А. Падалінскі. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. – 240 с.
11. Семянчук, А. Магнацкія двары як цэнтры гістарыяграфіі ў Вялікім Княстве Літоскі ў XVI ст. / А. Семянчук // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII ст.) : зборнік навуковых прац / рэдкал.: А. М. Янушкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 139–157.
12. Рыбчонак, С. Да праблемы паходжання магнатаў Глябовічаў – уладальнікаў Заслаўскага замка ў XVI ст. / С. Рыбчонак. // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII ст.) : зборнік навуковых прац / рэдкал.: А. М. Янушкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 79–104.
13. Рагаўскене, Р. Прыватныя архівы Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст. / Р. Рагаўскене // ARCHE Пачатак. – 2014. – № 6. – С. 340–355.
14. Падалінскі, У. А. Шляхта Вялікага Княства Літоўскага ў дыпламатычных місіях Рэчы Паспалітай (апошняя трэць XVI ст.) / У. А. Падалінскі // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы : навук. зб. / РІВШ – Мінск, 2010. – Вып. 3. – С. 188–208.
15. Цішчанка, В. Арганізацыя дыпламатычнай службы ў ВКЛ у канцы XIV–пачатку XVI ст. [Электронны рэсурс] / В. Цішчанка // Беларускі часопіс міжнароднага права і міжнародных адносін – 2005. – № 3. – Рэжым доступу: http://evolutio.info/content/view/774/113/ – Дата доступу: 23.06.2016.
16. Wolff, J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego. 1386–1795 / J. Wolff. – Kraków, 1885. – 698 s.


Полесгу